# МНАГАЗНАЧНЫЯ СЛОВЫ ЯК СРОДАК РАЗВІЦЦЯ ЗВЯЗНАГА МАЎЛЕННЯ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ

***Зорка Н. П.*** *(УА «МДПУ імя І. П. Шамякіна»)*
***Навуковы кіраўнік** – А. В. Солахаў, канд. філал. навук, дацэнт*

Праца з мнагазначнымі словамі праводзіцца ўжо ў 1-м класе. У далейшым яна пастулова паглыбляецца і пашыраецца. Працуючы з мнагазначнымі словамі, вучні пашыраюць свой слоўнік і развіваюць звязнае маўленне. Гэтаму ў вялікай меры спрыяюць наступныя практыкаванні: 1) растлумачыць значэнні слоў: *ліст (з сшытка, з дрэва), корань (частка дрэва, частка слова)*; 2) параўнаць значэнні слова *зямля* ў наступных словазлучэннях: *планета Зямля, пясчаная зямля, родная зямля*; 3) падабраць словы, якія б мелі па 2–3 значэнні, і з кожным значэннем скласці сказ; 4) падабраць блізкія па сэнсе словы (сінонімы) да выдзеленых слоў: ***кіслы** суп – (**сапсаваны** суп), **кіслы** настрой – (**сумны** настрой), **кіслая** ўсмешка – (**няшчырая** ўсмешка)*; 5) падабраць супрацьлеглыя па сэнсе словы (антонімы) да кожнага значэння дадзеных слоў: *моцнае сяброўства – нямоцнае сяброўства, моцная вяроўка – слабая вяроўка.*; 6) растлумачыць сэнс дзеясловаў у наступных сказах: *Нехта ў дзверы малоціць. Сэрца маё спявае. Звіняць галасы дзяцей. Песня ляцела над плошчай. Адспявала лета песні*; 7) растлумачыць сэнс прыметнікаў у словазлучэннях і скласці з імі сказы: *вішнёвае варэнне – вішнёвая сукенка; блакітныя фарбы – блакітныя далягляды; глыбокая ноч – глыбокая канава*; 8) скласці і запісаць сказы, падкрэсліць словы, якія маюць пераносны сэнс: *кіпіць (чайнік, праца), гарэць (зоркі, шчокі)* і г. д. 9) скласці сказы са словамі *цалуе, закрыла, едзе,* каб яны ўжываліся ў пераносным (прамым) значэнні: *Сонейка першымі промнямі цалуе наш край. Маці цалуе дачку. Наш цягнік едзе вельмі хутка. Едзе сонейка на хмарцы. Школа вочы закрыла, ціха ноч наступіла. Я заплюшчыла свае вочы, каб не бачыць гора людскога.*

Прыведзеныя намі прыёмы працы з мнагазначнымі словамі, як паказвае практыка, садзейнічаюць не толькі развіццю маўлення малодшых школьнікаў, але і развіццю іх самастойнасці, пазнавальнай актыўнасці і творчага мыслення. Аднак гэта дасягаецца толькі тады, калі праца праводзіцца сістэмна і накіравана на ўсебаковае развіццё асобы вучня.

МГПУ им. И.П.Шамякина